№№79–80
(3005–3006)

26–28 мая 2009 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Не забудзьце падпісацца на «Народную Волю» на другую палову 2009 года!

АКТУАЛІІ

Паказуха

Гэта быў сапраўдны сорам! Увесь свет даведаўся пра тое, якія маштабы набыла ў Беларусі паказуха. Увесь інтэрнэт абышлі здымкі, як "славуты горад Слонім" рыхтуецца да прыезду Аляксандра Лукашэнкі: на скорую руку кладзецца новы асфальт, фарбуюцца платы, як прадстаўнікі службы аховы абыходзяць дамы ўздоўж дарогі і папярэджваюць жыхароў, каб вокны, фіранкі, веснічкі ў дзень праезду "народнага прэзідэнта" былі шчыльна зачыненыя. Але не гэта ўзбудзіла інтэрнет. Найбольшы рэзананс выклікалі здымкі, на якіх, рыхтуючыся да прыезду кіраўніка дзяржавы, жанчыны збіраюць па полі дзьмухаўцы.

Высветлілася, што па загадзе дырэктара збіраць бяскрыўдныя кветачкі выйшлі супрацоўнікі слонімскай камвольна-прадзільнай фабрыкі — ад ткачых да бухгалтараў і юрыстаў. Вось дыскусія менавіта з гэтай нагоды і разгарнулася ў інтэрнэце — чым маглі пагражаць жоўценькія кветачкі кіраўніку дзяржавы?

Версіі, зразумела, розныя: ад банальнай алергіі на дзьмухаўцы да раздражняльнага ўздзеяння ўсяго, што хоць аддалена нагадвае пра аранжавы колер — колер украінскай рэвалюцыі. Але як па-мойму, то не ў алергіі тут справа, а ў лізаблюдстве. Нехта са слонімскіх кіраўнікоў палічыў, што жоўценькія кветачкі-пустазелле на полі "псуюць пейзаж" і, магчыма, будуць раздражняць стомленае вока кіраўніка дзяржавы, калі ён раптам кіне погляд з акна аўтамабіля...

У Слоніме зрывалі дзьмухаўцы, у Салігорску некалі белай фарбай "выпраўлялі" колер сталоўу бяроз уздоўж дарогі, па якой павінен быў ехаць Лукашэнка, у Міры перад яго візітам пару гадоў таму паставілі новы прыгожы плот, але так спяшаліся, што веснічак у ім не прадугледзелі, і людзям, каб выпаўзці з двара, праходзілася ісці па некалькі сот метраў да бліжэйшага скрыжавання дарог, дзе плот абрываўся... Мясцовыя начальнікі робяць з прэзідэнта няведама каго: нібы ён не ведае, што дзе плот — там павінны быць і веснічкі, што бярозы ніколі не бываюць зусім белымі, і што на лугах, акрамя травы, растуць яшчэ дзьмухаўцы, званочкі, рамонкі і іншыя прыгожыя кветачкі...

Карацей, слонімскія ўлады і самі праславіліся, і Аляксандра Лукашэнку аславілі. Думаю, ён прыняў адзінае правільнае ў такой сітуацыі рашэнне і ўвогуле перанёс візіт у Слонім на нязначаны тэрмін. Але... Аказалася, што і ехаць больш няма куды, бо ўсе астатнія пункты "паездак у рэгіёны" не падрыхтаваныя. У выніку Лукашэнка накіраваўся ў сваю родную вёску Александрыя на Шклоўшчыне. Безумоўна, там усё вычышчана і выбудавана. Але не будзем забываца і пра тое, што ўся краіна працавала на гэтую прыгажосць, ні да аднаго населенага пункта не было такой увагі, як да радзімы першага беларускага прэзідэнта. Зноў паказуха!

Але буйную кропку ў гэтым спектаклі са шматлікімі дзеючымі асобамі паставіў кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей. Напэўна, даведаліся ў Адміністрацыі, як людзі ставяцца да таго, што ў нас, калі хто прыб'ецца да ўлады, то за ім ланцужком на розныя цёплыя пасады прыстройваюцца і сват, і брат, і трэцяя вада на кісялі. Праверку фактаў сямейнасці ў органах улады праводзіла пракуратура. І, зразумела, такіх фактаў знайшла нямала. Пад гарачую руку кіраўніку Адміністрацыі трапіў Столінскі райвыканкам, дзе ўлада проста прыватызавана сямействам Дзямко. Аляксей Дзямко — старшыня райвыканкама, ягоны сын — кіраўнік аддзела райвыканкама па справах моладзі, сват — старшыня СПК "Палеская ніва", сястра жонкі — старшыня мясцовага савета дэпутатаў, брат — старшыня назіральнага савета СПК "Фядорскі"... "Можна прывесці шмат аналагічных прыкладаў па іншых рэгіёнах", — абураўся Макей.

Можна, Уладзімір Уладзіміравіч! Але перш чым далёка хадзіць, паглядзіце на шыльдачкі ў Адміністрацыі прэзідэнта. Тата-прэзідэнт сядзіць у адным кабінеце, сын — памочнік прэзідэнта — у суседнім, яшчэ адзін сын — кіруе не абы якім, а прэзідэнцкім спартыўным клубам. У Століне — сямейнасць, а тут — не?.. Так што і барацьба за чысціню радоў улады, аб'яўленая зверху, на паверку аказваецца ўсё той жа паказуха!

Святлана КАЛІНКІНА.

МІНСК—КІЕЎ

Сяргей Сідорскі і Юлія Цімашэнка сустрэнуцца 8 чэрвеня ў Кіеве

Прэм'ер-міністры Беларусі і Украіны Сяргей Сідорскі і Юлія Цімашэнка сустрэнуцца 8 чэрвеня ў Кіеве. Аб гэтым паведаміў журналістам кіраўнік беларускага ўрада.

"Мы дамовіліся з Юліяй Цімашэнка, што выканаем даручэнне нашых прэзідэнтаў, і 8 чэрвеня сустрэнемся ў Кіеве. Гэта будзе рабочы візіт урадавай дэлегацыі Беларусі", — адзначыў Сяргей Сідорскі.

Аналітыкі, аднак, сцвярджаюць, што самае галоўнае пытанне прэм'еры не вырашаць, і візіт вялікага поспеху мець не будзе. Справа ў тым, што бакам так і не ўдалося дамовіцца аб пастаўках украінскай электраэнергіі транзітам праз Беларусь у краіны Балтыі. Наша краіна заламіла такія тарыфы, што пастаўкі становяцца проста нявыгаднымі. Акрамя таго, нават не ўздымаюцца пытанні ні аб ратыфікацыі беларускім бокам пагаднення аб дзяржаўнай мяжы (гэтая праблема вельмі хвалюе Украіну), ні аб доўгу з боку ўкраінскіх суб'ектаў гаспадарання, які "завіс" яшчэ з сярэдзіны 90-х гадоў (тут ужо ўкраінскія ўлады не хочуць браць на сябе абавязкі па выплаце даўгоў фірм і прадпрыемстваў).

Затое, напэўна, нарэшце вырашыцца пытанне пэўзаемаразлікаў за пастаўкі паміж нашымі краінамі. Апошнім часам разлікі па кантрактах былі амаль спынены з-за таго, што курс нацыянальнай валюты Украіны быў вельмі нестабільным.

Алена НОВІКАВА.

ПАЛІТКУХНЯ

Калякін застаецца лідэрам партыі, якая не будзе камуністычнай

У суботу ў Мінску пачаў працу апошні з'езд Партыі камуністаў беларускай. Гэта была толькі першая яго сесія, але яна вырашала сапраўды важныя пытанні.

Больш за 200 дэлегатаў павінны былі вызначыцца з тым, ці трэба партыі адмовіцца ад назвы "камуністычная", а таксама выказаць давер альбо недавер кіраўніцтву.

Пераважная большасць дэлегатаў з'езда прагаласавала за Сяргея Калякіна, але ён ужо не атрымаў той пераканаўчай большасці галасоў, якую меў раней. За давер лідэру партыі Сяргеі Калякіну выказалася 130 дэлегатаў, супраць — 58 чалавек. Гэта самыя дрэнныя вынікі за ўсе гады, што Калякін знаходзіцца на чале партыі. І не дзіўна: ідэя перайменаваць партыю — не самая папулярная.

Ужо на з'ездзе стала зразумела, што не ўсе камуністы гатовы адмовіцца ад камуністычнага "прозвішча". І, дарэчы, не толькі старыя дзяды ўшаноўваюць старую назву. Так, вельмі эмацыйна выступіў на з'ездзе бадзёры і маладжавы палкоўнік Алег Шавалаў, які заявіў, што выступае катэгарычна супраць перайменавання, і заклікаў усіх, хто падзяляе ягоную пазіцыю, далучыцца да ініцыятыўнай групы па стварэнні... кампарыі.

І ўсё ж большасць дэлегатаў пагадзіліся з тым, што назву трэба мяняць, бо яна пачала замінаць развіццю партыі. Прапаноўвалася шэсць варыянтаў новых назваў, у выніку рэйтынгавага галасавання засталіся тры: Беларуская партыя левых, Партыя дэмакратыі і справядлівасці і Партыя "Радзіма". Час думаць у цяперашніх камуністаў ёсць да верасня — менавіта на пачатку восені павінна адбыцца другая сесія з'езда, на якой апазіцыйныя камуністы канчаткова развітаюцца з камунізмам.

Ілля КУЛІКОЎ.

З-ЗА КРАТАЎ

Аўтуховіч ляжыць пад кропельніцай

Нягледзячы на тое, што стан здароўя пагаршаецца з кожным днём, ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч не мае намеру спыняць галадоўку.

Нагадаем, прадпрымальнікі з Ваўкавыска Мікалай Аўтуховіч, Юрый Лявонаў і Уладзімір Асіпенка былі затрыманы 8 лютага гэтага года. Іх абвінавацілі ў наўмысным знішчэнні альбо пашкоджанні маёмасці.

16 красавіка, патрабуючы хутчэйшага разгляду справы ў судзе альбо змены меры ўтрымання, Аўтуховіч абвясціў галадоўку. Ідзе другі месяц галадоўкі. Стан здароўя Аўтуховіча пагаршаецца з кожным днём: "Па апошніх звестках Аўтуховіча абследавалі турэмныя медыкі. Зараз Аўтуховіч знаходзіцца пад кропельніцай. Яму з ягонай згоды ўводзяць глюкозу, каб хоць неяк падтрымаць аслаблы арганізм. Нягледзячы на гэта, Аўтуховіч не мае намеру спыняць галадоўку", — распавёў карэспандэнту "Народнай Волі" юрыст Алег Волчак.

Дададзім, што тэрмін расследавання справы і тэрмін утрымання пад вартай ваўкавыскім прадпрымальнікам працягнулі да 3 чэрвеня.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

НАДВОР'Е

Прагноз на 26—28 мая

Паводле прагнозу Рэспубліканскага гідраметэацэнтра, 26 мая ў Беларусі чакаецца невялікая воблачнасць, без ападкаў. Вецер пераменных напрамкаў 3—8 м/с. Тэмпература паветра ноччу +4—10°С, днём +19—25°С, на паўднёвым захадзе да +27°С.

У Мінску 26 мая невялікая воблачнасць, без ападкаў. Вецер пераменных напрамкаў 3—8 м/с. Тэмпература паветра ноччу +6—8°С, днём +21—23°С.

27 мая ў Беларусі пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у заходніх раёнах кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Вецер паўднёвы з пераходам на заходні 4—м/с, пры навальніцах парывы да 15 м/с. Тэмпература паветра ноччу +6°С, днём +22°С.

У Мінску 27 мая пераменная воблачнасць, без істотных ападкаў. Вецер паўднёвы з пераходам на заходні 4 м/с. Тэмпература паветра ноччу +9°С, днём +23–25°С.

28 мая па краіне воблачна з праясненнямі. Месцамі кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Вецер пераменных напрамкаў 4—9 м/с, пры навальніцах парывы да 15–18 м/с. Тэмпература паветра ноччу +6–12°С, па паўднёвым усходзе да +16°С, днём 12–18°С, па паўднёвым усходзе да +19–24°С.

Другое месца ў Еўропе

Па інфармацыі расійскіх статыстыкаў, якая базіруецца на звестках Еўрастата, за пазначаны перыяд інфляцыя ў нашай краіне склала 6,5 працэнта, ва Украіне — 6,9, у Расіі — 6,2 працэнта.

Калі ў краінах Еўрасаюза спажывецкія цэны ў першыя чатыры месяцы года ў сярэднім узраслі на 0,6 працэнта, дык у Беларусі рост цэн склаў 5,7, у Расіі — 5,8 працэнта, паведамляе АФН.

НУ И НУ!

Средний чек в магазине «Центральный» в Барановичах составил 2 тысячи 470 рублей

Местная газета "Intex-press" сообщила о том, как изменились продовольственные пристрастия жителей Барановичей: упал спрос на сыры и колбасы, но выросли объемы продаж дешевого вина.

Как рассказали "IP" в магазине "Продсервис", в апреле значительно выросли продажи растительного масла (на 57%), куриного мяса (на 22%) и макарон (на 5%). С начала года на треть выросли объемы продаж плодово-ягодного вина. Зато более охотно горожане покупали алкоголь остался невостребованным — уменьшились продажи коньяка (на 14%), слабоалкогольных напитков (на 13%) и даже водки (на 1%).

Подорожавшие за первый квартал продукты упали в цене. В первую очередь горожане стали экономить на сливочном масле, сахаре и муке. По данным директора магазина "Продсервис" **Елены МЯТЬ**, объемы продаж этих продуктов в апреле по сравнению с январем уменьшились в среднем на 15—20%. Менее охотно горожане покупали кондитерские изделия (продажи уменьшились на 14%), сыр (на 13%), крупы (на 11%), а также колбасные изделия (на 9%).

На фоне роста цен горожане стали более аккуратными в своих тратах. Как отмечают в некоторых магазинах города, расходы горожан на питание в апреле остались почти на том же уровне, что и в январе, и средний чек за последние четыре месяца незначительно изменился. Например, в магазине "Продсервис" в Южном микрорайоне средняя покупка в апреле выросла на 1 рубль по сравнению с началом года и составила 12.665 руб. Однако с учетом роста цен на продукты питания — более чем на 5% в среднем по Беларуси в январе—марте 2009 по отношению к декабрю 2008 — видно, что покупательская способность горожан упала.

Это кажется невероятным, но в самом центре города покупают мало. Средний чек в магазине "Центральный" в апреле составил всего 2470 рублей. Как рассказали "IP" в магазине, покупатели стали тратить меньше, чем раньше. "Покупают в основном по мелочи, — заметил один из работников магазина. — Одни хлеб, соль купят, другие — пачку семечек. Крупные покупки для нашего магазина уже в прошлом".

Снизили свои расходы на продукты питания и жители Северного микрорайона. Например, в магазине "Пинск" в апреле объемы продаж снизились в целом примерно на 6% по сравнению с январем.

АБОНЕМЕНТ 63 222
Народная Воля
Кому
Куда

ДОСТАВОЧНАЯ КАРТОЧКА 63 222
Народная Воля
Кому
Куда

ГАЗЕТА -- ЧЫТАЧЫ

Застаёмся разам!

Не заўважыце, як закончыцца падпісная кампанія на другую палову 2009 года.

Нягледзячы на складаную сітуацыю, "Народная Воля" не здраджвае Вам, шаноўныя чытачы. І ніколі не здрадзіць!

Застаёмся разам і ў другой палове 2009 года. Аформіць падпіску Вы можаце ў любым паштовым аддзяленні. А мінчане зрабіць гэта могуць яшчэ ў падпісных пунктах "Белсаюздруку".

Дарэчы, у другой палове 2009 года шэраг тыдняў будзе адзначаны не двухразовым, а трохразовым выхадам "Народнай Волі". Падпісны кошт у аддзяленнях "Белпошты" застаецца ранейшы: на месяц — 9500 рублёў, на тры месяцы — 28.500; для арганізацый, устаноў, прадпрыемстваў кошт падпіскі на месяц — 15.000 рублёў. А вось у падпісных пунктах "Белсаюздруку" тарыфы ніжэйшыя — 8930 рублёў на месяц для індывідуальных падпісчыкаў і 14.100 — для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў.

Падпісныя індэксы "Народнай Волі" ў каталогах "Белпошты" і "Белсаюздруку":

63222 — для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 — для прадпрыемстваў і арганізацый.

Вы — з "Народнай Воляй",
"Народная Воля" — з Вамі!

ВМЕСТО КОММЕНТАРИЯ

За суточный набор продуктов надо выложить минимум 8 тысяч

Медики не перестают утверждать: чтобы быть здоровым, надо правильно питаться. Основу рациона здорового человека должны составлять хлеб, блюда из круп и макаронных изделий. В ежедневное меню необходимо включать овощи и фрукты, рыбу, нежирное мясо. Не следует пренебрегать при соблюдении здорового питания и употреблением молока, кефира, творога, сыра и йогурта.

Диетологи рассчитали, сколько и каких продуктов в сутки должен употреблять в пищу взрослый человек:

Молоко, кефир, йогурт 1,5% жирности — 300 г;

Творог нежирный — 100г или сыр 30 г;

Сметана 20% — 10 г (1 ст. ложка);

Яйцо — 2—3 шт. в неделю;

Говядина или курица — 200 г;

Рыба нежирных сортов — 50 г;

Картофель — 250 г;

Овощи — не менее 400 г;

Свежие фрукты и ягоды — 300 г;

Соки — 100 г;

Масло растительное — 20 г (1ст ложка);

Масло сливочное — 10 г;

Хлеб — 150 г (5 кусков);

Крупа овсяная и гречневая — 30 г (тарелка каши);

Макаронные изделия — 10 г (2раза в нед.);

Сахар, варенье, сладости — 30 г;

Мед — 15 г.

Несложно подсчитать, что этот набор продуктов потянет явно не на 2 тысячи 470 рублей. Этих копеек хватит на баночку йогурта и полпачки творога! Ежедневно, соблюдая рекомендации врачей-диетологов, белорусам надо тратить на продукты минимум 8 тысяч. И это в том случае, если покупать, мягко говоря, не самые дорогие продукты и в основном белорусского производства. Именно на такие цены мы ориентировались, когда подсчитывали, сколько стоит суточное меню белоруса.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

КСТАТИ

С такой экономией, какую демонстрируют жители Барановичей, наш народ скоро дойдет до "пайки" заключенного, сидящего в карцере. Суточное меню белорусского заключенного, приблизительно такое: хлеб — 450 г, рыба — 60 г, картофель — 250 г, каша — 50 г, овощи — 200 г, масло растительное — 9г, соль — 10 г и кружка чая. Вот и считайте,

ДЫСКУСІЯ

Александр Мілінкевич
Савецкая крайняя прадседацель

Минск 21 травня 2009

Шаноўны Аляксандр Уладзіміравіч!

Пісьмо, апублікаванае ў нумары N 75-76 "Народнай Волі" за 19 мая 2009 года, мае яўна паклёпніцкі, "заказны" характар. А вось я так не лічу. У рэшце рэшт, кожны мае права на сваё бачанне праблемы. І меркаванні, развагі, версіі аўтара нельга ўспрымаць як паклёп. З імі толькі можна пагадзіцца альбо не пагаджацца. Яны, дарэчы, не патрабуюць і нейкіх доказаў, гэта — не канкрэтныя факты, а толькі здагадкі.

Зыходзячы з прынцыпаў плюралізму, "Народная Воля" з задавальненнем друкуе сёння Ваш ліст да дэмакратычных актывістаў, у якім, Аляксандр Уладзіміравіч, выкладзена Ваша асабістая пазіцыя "адносна сітуацыі ў краіне і вакол яе".

Іосіф СЯРЭДЗІЧ,
галоўны рэдактар
газеты "Народная Воля".

Ад галоўнага рэдактара

Шчыра кажучы, 14 гадоў я выдаю "Народную Волю", але такіх пагрозлівых лістоў не атрымліваў нават ад Аляксандра Лукашэнкі і яго Адміністрацыі.

Спадар Мілінкевіч! Не трэба нас пужаць. Друкуючы матэрыял "Отбеливатель "М.", мы нічый заказ не выконвалі. Чаму змясцілі на старонках газеты версію вядомага журналіста М.Падаляка — аб гэтым сказана ва ўрэзцы: праблема ўжо каторы тыдзень абмяркоўваецца ў апазіцыйных колах, але яна выходзіць далёка за рамкі палітычнага бамонда, мае лёсавызначальнае значэнне для мільёнаў беларусаў. Менавіта гэта, і толькі гэта, падштурхнула "Народную Волю" разгарнуць на сваіх старонках дыскусію, звязаную з вострай палітычнай сітуацыяй, якая склалася ў краіне? Што, мы не маем такога права?

Вы, Аляксандр Уладзіміравіч, лічыце, што *"матэрыял, пададзены ў №№75—76 "Народнай Волі" за 19 мая 2009 года, мае яўна паклёпніцкі, "заказны" характар".* А вось я так не лічу. У рэшце рэшт, кожны мае права на сваё бачанне праблемы. І меркаванні, развагі, версіі аўтара нельга ўспрымаць як паклёп. З імі толькі можна пагадзіцца альбо не пагаджацца. Яны, дарэчы, не патрабуюць і нейкіх доказаў, гэта — не канкрэтныя факты, а толькі здагадкі.

Зыходзячы з прынцыпаў плюралізму, "Народная Воля" з задавальненнем друкуе сёння Ваш ліст да дэмакратычных актывістаў, у якім, Аляксандр Уладзіміравіч, выкладзена Ваша асабістая пазіцыя "адносна сітуацыі ў краіне і вакол яе".

Іосіф СЯРЭДЗІЧ,
галоўны рэдактар
газеты "Народная Воля".

У сувязі з апошнімі палітычнымі падзеямі хачу звярнуцца да Вас і выказаць свае меркаванні адносна сітуацыі ў краіне і вакол яе. Мне важна, каб Вы ведалі маю пазіцыю непасрэдна ад мяне.

Ацэнка былой палітыкі Еўрасаюза адносна Беларусі

Як вядома, пачатак шырокага эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва з Беларуссю Еўрапейскі Саюз ставіў да нядаўняга часу ў залежнасць ад выканання нашай краінай вядомых "12 ўмоў". Гэта прынцыповыя ўмовы, якія базуюцца на каштоўнасцях еўрапейскай супольнасці. І з падыходу дня яны, відавочна, не павінны быць знятыя. Тым не менш ранейшая палітыка не прынесла пазітыўных вынікаў. Больш за тое, сітуацыя пагаршалася. Краіна працягвала самаізаляваца, эканоміка рабілася ўсё больш неканкурэнтаздольнай і "падсела" на расійскую энерганосьбітаў ды спрыяльны доступ на расійскі рынак. Цяпер жа перад Масквой стаіць новы выбар: альбо настойваць на працягу праекта і прымушаць беларускае кіраўніцтва выконваць свае абавязкі па фактычнай інкарпарацыі РБ ў склад РФ, альбо шукаць іншыя падыходы, каб захаваць Беларусь у сваім геапалітычным полі. Расія ўсё больш схіляецца да пабудовы "рынкавых адносін" з нашай краінай, каб, паступова ліквідаваўшы эканамічны суверэнітэт, пазбавіць нас і палітычнай самастойнасці. Яна пачала падвышаць цэны на газ, і беларускія ўлады вымушаны браць у яе чарговыя кабальныя крэдыты, скатваючыся ў даўгавую яму. Па ацэнках МВФ, у гэтым годзе беларуская эканоміка патрабуе ўжо 10,7 мільярда долараў крэдытаў.

Відавочна, што адмова ад палітычнага праекта "Саюзная дзяржава" робіць незразумелымі перспектывы адносін паміж яго ўдзельнікамі. А таму ніхто не хоча браць на сябе адказнасць, каб прызнаць, што праект праваліўся. Для расійскага кіраўніцтва гэта азначала б канстатацыю геапалітычнай паразы. А для беларускага — глыбокі эканамічны крызіс, а можа быць, і поўны калапс нашай нерэфармаванай гаспадаркі, якая пакуль трымаецца на плыву дзякуючы расійскім датацыям.

Да нядаўняга часу адсутнасць хоць якіх палітычных перспектыў у заходнім накірунку рабіла сітуацыю для беларускіх улад "патавай". Рэжым не мог спыніць праект "Саюзная дзяржава" і не меў магчымасці распачаць палітычны дыялог і эканамічнае супрацоўніцтва з ЕС. А гэта адзіны рэальны партнёр па мадэрнізацыі беларускай гаспадаркі, без чаго мы рызыкуем пазбавіцца нашага суверэнітэту.

Да падмацаваны хоць якімі сістэмнымі дзеяннямі, якія дазвалялі б стварыць адпаведныя механізмы карэкціроўкі беларускай дзяржаўнай палітыкі. А пазіцыя Еўрасаюза адносна Беларусі выглядала з названай вышэй прычыны фармальнай і пасіўнай.

Сённяшнія ўзаемаадносіны Беларусі і Расіі

Перспектывы развіцця адносін РБ і РФ на сённяшні дзень наўпрост звязаны з палітычным праектам "Саюзная дзяржава", лёс якога застаецца нявызначным. Ад пачатку бакі ставілі перад сабой абсалютна розныя мэты. Расія — паступовае паглынанне Беларусі, а беларускія ўлады разлічвалі на доўгатэрміновае затрыманне велізарных датацый у выглядзе танных энерганосьбітаў ды спрыяльнага доступу на расійскі рынак. Цяпер жа перад Масквой стаіць новы выбар: альбо настойваць на працягу праекта і прымушаць беларускае кіраўніцтва выконваць свае абавязкі па фактычнай інкарпарацыі РБ ў склад РФ, альбо шукаць іншыя падыходы, каб захаваць Беларусь у сваім геапалітычным полі. Расія ўсё больш схіляецца да пабудовы "рынкавых адносін" з нашай краінай, каб, паступова ліквідаваўшы эканамічны суверэнітэт, пазбавіць нас і палітычнай самастойнасці. Яна пачала падвышаць цэны на газ, і беларускія ўлады вымушаны браць у яе чарговыя кабальныя крэдыты, скатваючыся ў даўгавую яму. Па ацэнках МВФ, у гэтым годзе беларуская эканоміка патрабуе ўжо 10,7 мільярда долараў крэдытаў.

Відавочна, што адмова ад палітычнага праекта "Саюзная дзяржава" робіць незразумелымі перспектывы адносін паміж яго ўдзельнікамі. А таму ніхто не хоча браць на сябе адказнасць, каб прызнаць, што праект праваліўся. Для расійскага кіраўніцтва гэта азначала б канстатацыю геапалітычнай паразы. А для беларускага — глыбокі эканамічны крызіс, а можа быць, і поўны калапс нашай нерэфармаванай гаспадаркі, якая пакуль трымаецца на плыву дзякуючы расійскім датацыям.

Да нядаўняга часу адсутнасць хоць якіх палітычных перспектыў у заходнім накірунку рабіла сітуацыю для беларускіх улад "патавай". Рэжым не мог спыніць праект "Саюзная дзяржава" і не меў магчымасці распачаць палітычны дыялог і эканамічнае супрацоўніцтва з ЕС. А гэта адзіны рэальны партнёр па мадэрнізацыі беларускай гаспадаркі, без чаго мы рызыкуем пазбавіцца нашага суверэнітэту.

Новая палітыка Еўрасаюза

Еўрапейскі Саюз, прагматычна ацаніўшы неэфектыўнасць сваёй ранейшай палітыкі адносна Беларусі, спрабуе змяніць яе. Стратэгія засталася той жа, а менавіта — скіраванай на палітычную дэмакратызацыю і эканамічную лібералізацыю нашай дзяржавы. Змянілася тактыка: яна стала пакрокавай. Не адмаўляючыся ад ранейшых умоў, ЕС мяркуе, што рух мусіць адбывацца з абодвух бакоў. Першымі крокамі насустрач былі вызваленне палітвязняў і прыпыненне візавых абмежаванняў для шэрагу беларускіх чыноўнікаў.

Сёння ЕС пачынае праводзіць новую міжнародную палітыку. Яе сутнасць — у павелічэнні ўплыву на геапалітычныя працэсы ў нашым рэгіёне. У прыватнасці, датычна Беларусі інтарэсы ЕС палягаюць на ўзмацненні бяспекі, забеспячэнні стабільнага транзіту, падтрымцы незалежнасці, развіцці палітычнага і эканамічнага супрацоўніцтва. Вырашальную ролю ў прыспешванні зняцця палітычнай ізаляцыі з нашай краіны адыграла расійска-грузінская вайна.

Еўрасаюз пачаў праводзіць больш гнуткую палітыку крытычнага дыялогу і дазаванага супрацоўніцтва, ступень якога будзе залежаць ад рэальных крокаў у кірунку дэмакратызацыі краіны. Мэта гэтага дыялогу і супрацоўніцтва — ўцягванне беларускіх улад у паступовы працэс рэфармавання эканамічнай і палітычнай сістэмы краіны, які раней ці пазней павінен прывесці да трансфармацыі сённяшняй мадэлі палітычнага ладу. Рэалізацыя новай палітыкі ЕС павінна адбыцца праз далучэнне Беларусі да праграмы "Усходняе партнёрства".

"Усходняе партнёрства" — важны крок Еўрапейскага Саюза насустрач нашай краіне, прызнанне яе прыналежнасці да еўрапейскай цывілізацыйнай прасторы. Нарэшце, гэта шанц паступова інтэгравацца ў агульнаеўрапейскія структуры, а ў будучым і ўступіць у Еўрасаюз.

Разам з тым збліжэнне з аб'яднаай Еўропай праз "Усходняе партнёрства" — гэта гістарычны выклік для нашай краіны, улад, грамадзянскай супольнасці і грамадзян. Гэта магчымасць мадэрнізавацца і еўрапеізаваць Беларусь. Мы не маем права згубіць яе. Удзел у праграме адкрые рэальныя перспектывы стварэння зоны свабоднага гандлю з Еўрасаюзам, атрымання інвестыцый, удзелу ў еўрапейскіх энергетычных праектах, змяншэння кошту віз, а з часам і далучэння Беларусі да Шэнгенскай прасторы. Прывёўшы наша заканадаўства ў адпаведнасць з еўрапейскімі прававымі нормамі і стандартамі, "Усходняе партнёрства" можа дазволіць нам мець такія ж дачыненні з ЕС, што сёння маюць Нарвегія, Швейцарыя, Ісландыя.

Дыялог і апазіцыя

Збліжэнне Еўрасаюза і Беларусі выклікае ў прадстаўнікоў дэмакратычных сіл супярэчлівыя пачуцці.

Доўгі час апазіцыя лічыла сябе адзіным прадстаўніком дэмакратычнага свету на беларускай зямлі. Нам цяжка прымірыцца з тым, што не мы з'яўляемся аўтарамі сцэнарыя дыялога. Некаторыя лічаць, што сустрэчы Хаўера Саланы ці Бенедзікта XVI з "апошнім дыктатарам Еўропы" непрымальныя і яны не мусілі адбыцца. Гучаць абвінавачанні ў бок аб'яднаай Еўропы ў "недальнабачнасці", "наіўнасці", "здрадзе дэмакратыі", "легітымізацыі рэжыму". Еўрапейскім палітыкам нават пагражаюць "адказнасцю" за тое, што яны не дамагліся ў Беларусі дэмакратыі.

Падзел унутры сённяшняй беларускай апазіцыі палягае на тым, што адны працягваюць змагацца выключна супраць Лукашэнкі, а другія — перадусім за Беларусь і яе еўрапейскі выбар. Спадзяванні першых — на крызіс, які нібыта аўтаматычна ліквідуе дыктатуру. Другія, і я ў тым ліку, не бачаць ніякага лепшага альтэрнатыўнага палітычнага праекта, чым збліжэнне Беларусі з ЕС.

Ніхто ў Еўропе не лічыць, што ў нас квітнее дэмакратыя. Таму галоўнай умовай паўнавартаснага ўдзелу ў праграме "Усходняга партнёрства" якраз і з'яўляецца ўстойлівы прагрэс у справе дэмакратызацыі. Удзел ва "Усходнім партнёрстве" — гэта не гарантыя змен да лепшага ў нашай краіне, гэта шанц на такія змены. Сёння мы маем толькі стрыманы аптымізм. А каб дадзены нам шанц ажыццявіўся, патрэбны воля і адказнасць.

Уключэнне ў поўнамаштабнае супрацоўніцтва з ЕС — працэс вельмі складаны і далёка не аўтаматычны. Ён нясе шмат выклікаў як для ўлад, так і для грамадзянскай супольнасці. Але разумнай альтэрнатывы яшчэ ніхто не прапанаваў. Сёння адмова ад еўраінтэграцыі стварае наўпроставую пагрозу для незалежнасці Беларусі.

Сёння структуры Еўрасаюза спрабуюць шчыльна працаваць з уладай, каб з дапамогай эканамічных стымулаў спрыяць працэсам паваротку нашай краіны да большай адкрытасці і праўдзівальнасці. Улады са свайго боку падаюць сігналы, што яны могуць пайсці на некаторую эканамічную лібералізацыю. Пры гэтым вядома, што дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця — далёка не прыярытэт для беларускага рэжыму. А таму галоўная роля ў гэтай справе мусіць належаць грамадзянскай супольнасці. Аб'яднаная Еўропа не будзе вырашаць да нас пытанні дэмакратызацыі беларускага грамадства. Гэта марныя спадзяванні. Весці наўпроставую няспынную працу з грамадзянамі нашай краіны можам і абавязаны толькі мы.

Сёння выключна важна адзінства і аб'яднанне патэнцыялу беларускіх праеўрапейскіх сіл. Мы мусім прадэманстраваць, што нас шмат, што мы разам у імкненні далучыць Беларусь да працэсаў еўрапейскай інтэграцыі, што мы гатовы да рашучых дзеянняў дзеля таго, каб "еўрапейскі выбар" Беларусі быў зроблены канчаткова і незваротна.

Першым крокам нашага аднаўлення павінен стаць Кангрэс праеўрапейскіх сіл Беларусі з удзелам вядучых палітыкаў аб'яднаай Еўропы. Мы павінны разам абмеркаваць еўрапейскія перспектывы для нашай краіны, вызначыць практычныя крокі. Гэты Кангрэс мусіць стаць форумам усіх прыхільнікаў еўрапейскай Беларусі.

Таму я сёння заклікаю актывістаў усіх палітычных партый, грамадскіх арганізацый, ініцыятыў, усіх грамадзян Беларусі, якія падзяляюць ідэю еўрапейскага выбару для нашай краіны, распачаць працу па падрыхтоўцы Кангрэса праеўрапейскіх сіл. Пачаткам гэтай працы мусіць стаць стварэнне ініцыятыўных груп па правядзенні рэгіянальных сходаў, каб вылучыць дэлегатаў Кангрэса. Ідэя і каштоўнасць еўрапейскай, свабоднай і дэмакратычнай Беларусі важней за нашы палітычныя разыходжанні і супярэчнасці.

Беларусь вяртаецца ў Еўропу!

Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ.

Май, 2009.

Кіраўнікоў сваіх абласцей не ведае амаль палова жыхароў беларускіх рэгіёнаў

Пра гэта сведчаць вынікі апошняга даследавання сацыялагічнага цэнтра "Зеркало-Інфо".

Паводле гэтых звестак, прозвішча кіраўніка Гродзенскай вобласці **Уладзіміра Саўчанкі** назвалі 56 працэнтаў апытаных, 18 працэнтаў яго не ведалі, а 26 працэнтаў сказалі, што ім цяжка адказаць на гэтае пытанне. Кіраўніка Брэсцкай вобласці **Канстанціна Сумара** ведаюць 55 працэнтаў, а вось 45 працэнтаў не ведаюць ці не памятаюць.

Крыху горшая сітуацыя ў Віцебскай і Гомельскай абласцях. Напрыклад, на Віцебшчыне 4 працэнты апытаных яшчэ не праінфармаваны пра зыход **Уладзіміра Андрэйчанкі** ў Мінск і ўпісалі яго прозвішча. Такая ж сітуацыя на Магілёўшчыне з **Барысам Батурам**, які таксама ўжо працуе ў сталіцы. А прозвішча яго зменшчыка **Пятра Рудніка** ведаюць толькі 26 працэнтаў апытаных.

Родители малолетних преступников должны возмещать расходы на их содержание в колониях

Генеральный прокурор Беларуси "**Григорий Василевич** полагает, что в белорусском законодательстве следует предусмотреть обязанность родителей возмещать расходы, которые несет государство за нахождение их несовершеннолетних детей в колониях", сообщили агентству "Интерфакс-Запад" в Генпрокуратуре Беларуси. Там отметили, что "речь идет лишь о тех родителях, которые не занимались воспитанием детей — пьянствовали, вели аморальный образ жизни, были дурным примером для своих детей".

С МОЕЙ КОЛОКОЛЬНИ

Весна. Сирень. И немного грустно...

Весна в городе обычно заканчивается салютом сирени... В цветущей сирени, на мой взгляд, есть сила воли, целеустремленность, я бы даже сказала, физическая страсть. Весной природа безупречна даже в городе. В этом году кусты сирени и в самых затрапезных уголках мегаполиса, где-нибудь за ЖЭСами или районными УВД, и то выглядят как на цветочной выставке в Челси. Восторг! А что делается в Ботаническом саду... "Весной, — сказала моя подруга, обходя куст в одноэтажный дом, сорт которого именуется "Маршал Жуков", и под обстрелом которого не жалко и умереть, — можно подумать, что венец творенья — не человек, а эти могучие цветы-"снаряды". Но она, призналась дальше, не любит сирени. Отец — фронтовик, боевой летчик, офицер Константин Кусливый ушел из жизни в мае ровно 10 лет назад. В мае 45-го его приветствовал сиреневый весны мир. А в 1999-м этими же цветами Минск навсегда провожал ветерана... С тех пор для нее — это запах вечной разлуки.

Самые важные события в жизни человек подсознательно связывает с природой...

Но в эту пору в городе люди как будто отступают на второй план.

...В маленький фонтан величиной в детский надувной бассейн за Белгосфилармонией прилетели селезень с уткой. Где — Свислочь, а где — филармония... Но "парочка" искала, видимо, укромное местечко вот и приземлилась на бульваре Мулявина. Тщетно. Собралась толпа: дети, студенты, бабушки. Обступили, как в цирке — эка невидаль. А вот невидаль! Весной мы, люди асфальта, ждем, жаждем услышать позывные из самых недр и, вроде, сами очноститься... Дитя с помпоном на голове ивовым прутиком легко достала спину городской прикормленной непугливой утки. "Нашла чему мешать", — строго сказала бабушка и отвела девочку подальше. Все благодарно посмотрели ей вслед: время живой природы в городе!

А в Ботаническом саду попрежнему живут лебеди... Пара. Была еще одна, но распалась. Вернее, разбили пару люди. Одной птице кто-то недавно скрутил голову (именно так рассказывают — не застрелил, а скрутил). Но природа не кричит о своих потерях. За что мы ее, наверное, и любим: мы ей гадим, а она с достоинством молчит... Вот теперь даже новый обычай родился — молодожены после загса фотографируются в Ботаническом саду. Среди шикарных цветочных алей... И рядом тихо скользит по каналу одинокий лебедь без пары. Вот какая аллегория...

У Свислочи опять стоят рыбаки. "Вы что, даже есть будете то, что ловите?" Меня чуть не забросали гроздьями гнева... "Да у нас раки водятся! Да сомы... да судачки..." Я ретировалась. Хорошо! Пусть водятся, ловятся... Чувства рыбака-горожанина надо щадить. Ведь, в конце концов, даже если и на съедение, то все равно для красоты. Люди с удочками рядом с главным проспектом города? Да такой пейзаж стоит тысячи евро! Потому что — экология! Когда-то приезжали с Чехии, восхищались: у них зайцы на лужайках в городе! Когда-то приезжали с Канады, удивлялись: у них лани в палисадниках за магазином... Но, в общем-то, нам было не до этого: страна десятилетия подряд решала квартирный и продовольственный вопрос. Бараки, хрущевки, брежневки... Очереди, очереди, очереди. Не до природы, как бы сохранить человека и его потомство. Наконец, теперь кое-кто обрел даже землю в собственность в черте города. "Слушай, — говорит недавно товарищ, — в этом году нашествие скворцов на участок! Портят только что посаженный газон. Я в бешенстве! У меня элитная трава сорта "премиум"! Словил одну птицу, посадил в клетку, думал для острастки поставлю ее в центр лужайки, чтоб остальные сородичи знали... Так сначала она клевалась и царапалась, а наутро... сдохла! От злости, представляешь?.."

No comment. Потому что на русском у меня даже слов в ответ не нашлось товарищу.

Да, трудно природе с нами, горожанами... Но сколько лет ей, и сколько в конце концов, нам? Вот многое ею и прощается. Иначе лететь бы нам давно в космические тартарары.

Цветет сирень. Цветы Победы, любви и прощания... Жалко, что заканчивается весна в городе.

Елена МОЛОЧКО.

РУБАМ!

Адукацыя больш як за 5 мільёнаў. Куды болей?

Днямі на прэс-канферэнцыі першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр Жук сказаў, што, маўляў, рэзкага росту кошту навучання ў беларускіх ВНУ не прадбачыцца.

"Кошт навучання ўзгодніны не толькі з зацікаўленымі ведамствамі, але і з прадстаўнікамі ВНУ, — адзначыў Аляксандр Жук. — *Мы спецыяльна распрацавалі дакумент, згодна з якім прапанавалі не павышаць тарыфы на навучанне".*

Так і хочацца запытацца ў намесніка міністра: а куды болей павышаць? Ці змогуць беларусы сёння аплачваць адукацыю хаця б па мінулагодніх тарыфах?

Год навучання ў прэстыжных ВНУ краіны ўжо даўно перавышае сярэдняя заробкі беларусаў у некалькі разоў. Напрыклад, у гэтым навучальным годзе ў пяці самых запатрабаваных універсітэтах Беларусі (з пункту гледжання ўступнага конкурсу) кошты былі ўстаноўлены завобалічныя:

Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт — 4.740.000—5.700.000 рублёў;

Беларускі дзяржаўны універсітэт — 2.984.000—4.200.000 рублёў;

Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт — 2.850.000—3.200.000 рублёў;

Акадэмія кіравання пры прэзідэнце РБ — 3.034.000 рублёў;

Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт — 2.965.000—3.095.000 рублёў.

І за гэты ж год заробкі беларусаў не толькі не павысіліся, а, наадварот, зменшыліся.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ДАРЭЧЫ

На платныя аддзяленні прыём павялічаны

На той жа прэс-канферэнцыі Аляксандр Жук паведаміў, што падчас сёлетняй уступнай кампаніі ў дзяржаўныя ВНУ прыём на платнай аснове будзе павялічаны на 1,8 тысячы студантаў, а ў прыватныя ВНУ скарочаны на 1 тысячу. У выніку ў дзяржаўныя ВНУ на ўмовах аплаты будзе прынята 49,2 тысячы чалавек, з іх на дзённую форму навучання — 23,1 тысячы, на завочную і вячэрнюю — больш за 26 тысяч. У прыватныя ВНУ прыйдуць вучыцца 11,7 тысячы чалавек, з іх на дзённую форму навучання — 3,7 тысячы, на завочную — 8 тысяч чалавек.

Што тычыцца бюджэтных аддзяленняў, то ў параўнанні з мінулым годам на некаторыя спецыяльнасці таксама прыём першакурснікаў будзе павялічаны. У прыватнасці, па такіх профілях, як "ахова здароўя" на 27,6%, "служба бяспекі" (камп'ютэрная бяспека, ядзерная і радыяцыйная бяспека, ваенныя спецыяльнасці) на 11,4%, "экалагічныя навукі" на 11%, "камунікацыі" на 5,8 працэнта.

Браславскими озерами интересуются российские олигархи

Российские олигархи рассматривают возможности реализации инвестиционных проектов на территории Национального парка "Браславские озера", сообщил БЕЛТА и. о. генерального директора нацпарка **Андрей Кудин**.

В первую очередь рассматриваются возможности вложения инвестиций в развитие туристического комплекса нацпарка, прежде всего в строительство баз отдыха. Во вторую очередь бизнесменов интересуют охотничий туризм.

Народная воля
http://www.nv-online.info
26—28 МАЯ 2009 г.

СИТУАЦИЯ

Санкции не отменены, но временно не действуют

Министерство финансов США продлило до 30 ноября 2009 года решение о смягчении санкций в отношении двух белорусских предприятий — лидской "Лакокраски" и объединения "Полоцк-Стекловолокно", входящих в состав концерна "Белнефтехим".

Как сообщает официальный сайт Минфина США, американским гражданам разрешено сотрудничество с этими предприятиями до 30 ноября 2009 года. В то же время собственность этих двух предприятий на территории США остается заблокированной в соответствии с правительственным распоряжением. "Гражданам США также запрещено через или при посредничестве предприятий "Лакокраска" и "Полоцк-Стекловолокно" покупать продукцию, услуги и технологии у других субъектов хозяйствования, внесенных в список", — подчеркивается в сообщении.

Напомним, что в ноябре 2007 года США ввели экономические санкции в отношении концерна "Белнефтехим" в связи с нарушением прав человека в Беларуси. Двусторонние отношения ухудшились в марте 2008 года после того, как власти Беларуси отказались освободить бывшего кандидата в президенты Александра Козулина (на тот момент последнего из шести признанных международным сообществом политзаключенных). Послы Беларуси и США были отозваны из Вашингтона и Минска для консультаций; штаты обоих посольств сокращены до минимума.

Введенные санкции, в частности, предусматривали замораживание всех находящихся под юрисдикцией США банковских счетов концерна и его представительств в Германии, Латвии, Украине, России и Китае, а также счетов дочерней компании "Белнефтехим Ю-эсэй". Кроме того, американским бизнесменам предписывалось воздержаться от контактов с концерном.

В марте 2008 года были опубликованы уточнения, согласно которым под действие санкций подпадали также предприятия, доля "Белнефтехима" в которых составляет 50% и более.

Однако после того, как белорусские власти освободили всех политзаключенных, Минфин США на полгода смягчил экономические санкции в отношении предприятий "Лакокраска" и "Полоцк-Стекловолокно". В феврале 2009 года действие этого решения было продлено до 1 июня. И вот теперь новая отсрочка. Дело в том, что США требуют от Беларуси более широких демократических преобразований, а не только освобождения политзаключенных. Потому занимают в вопросе санкций более жесткую позицию, чем Европа.

Олег СНОВ.

Пажар у цэнтры Мінска

У мінулую нядзелю адбыўся пажар у будынку былой мінскай турмы па адрасе Кальварыйская, 36.

Чорныя клубы дыму былі бачны за некалькі кіламетраў.
Гарэлі адходы скураазмяняльніка і неэксплуатуемы будынак. Бліжэй да апоўначы агонь быў спынены.

РЭВІЗІЯ

Дзяржкантроль нарэшце датумкаў, адкуль бяруцца рэкордныя надоі

Камітэт дзяржаўнага кантролю, здаецца, высветліў, як сельгаспрадукцыя малюе "рэкорды па надоях". Праверка пачалася з сельгаспредпрыемства "Агра-Селішча" Ушацкага раёна Віцебшчыны. І кантралёры звярнулі ўвагу на тое, што ў гаспадарцы далёка не ўсе каровы даюць малако. Так, 227 буронак праходзілі па дакументах як малочныя, а 188 — як тыя, якія пастаўлены на адкорм перад здачай на мясакамбінат. Зразумела, што і апошнія ў пераважнай большасці малако даюць. Але надоі ад "мясных"прыпісваліся іх малочным сяброўкам. Так і вымалёўваліся прыстойныя паказчыкі на адну карову.

Як толькі кантралёры капанулі глыбей, то высветлілася, што гэты метад "павышэння надояў" вельмі распаўсюджаны. У тым жа Ушацкім раёне, у суседняй гаспадарцы "Ільюшанскі", з агульнага статку ў 800 кароў 325 аказаліся "мясныя".

Калі кіраўнікі прадпрыемстваў выпісвалі сабе прэміі за высокія малочныя паказчыкі, то ім прыйдзецца мець справу з пракурорамі — матэрыялы праверкі перададзены ўжо ў адпаведную структуру. Але поле дзейнасці для пракураў можа стаць значна большым. Згодна статыстыцы, толькі ў гаспадарках Віцебскай вобласці знайшлося 24,4 тысячы "мясных кароў", што складае 12% ад агульнага статка.

Ілля КУЛІКОЎ.

ТРЫВОГА!

Банкі пачынаюць адмаўляць прадпрыемствам у выдачы крэдытаў на выплату зарплаты

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі заяўляе, што беларускія банкі пачынаюць адмаўляць прадпрыемствам у выдачы крэдытаў на выплату зарплаты працоўным.

— У красавіку–маі пачалі паступаць сігналы аб затрымцы зарплаты працоўным калектывам. Справа ў тым, што банкі пачынаюць адмаўляць прадпрыемствам у выдачы крэдытаў на зарплату нават пры пагашэнні папярэдняга крэдыту, — заявіў намеснік старшыні ФПБ Андрэй Лук'яновіч у Мінску на пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях.

У гэтай сувязі ФПБ звярнулася да ўрада з просьбай аказаць садзейнічанне ў рашэнні гэтай праблемы. Ён таксама заўважыў, што ў прафсаюзы сталі паступаць скаргі ад насельніцтва з нагоды праблем па пагашэнні спажывецкіх крэдытаў, асабліва крэдыту на будаўніцтва жылля, у тым ліку на фоне панижэння прыбытку з-за вымушаных адпачынкаў і няпоўнага працоўнага тыдня.

— ФПБ занепакоена наяўнасцю прадпрыемстваў, якія працуюць па скарочаным працоўным тыдні, — сказаў А.Лук'яновіч.

Ён таксама прызнаў, што маюцца факты неаплачаных адпачынкаў па ініцыятыве наймальнікаў, масавых афармленняў прастояў з аплатай працаўнікам 2/3 тарыфнай стаўкі. Андрэй Лук'яновіч прывёў такія даныя: у сакавіку ў параўнанні з лютым колькасць працаўнікоў, якім былі прадастаўлены "прымусовыя адпачынкі", вырасла на 47% да 51 тыс. чалавек. Колькасць працоўных з няпоўным працоўным тыднем — на 13,7% да 65 тыс. чалавек, паведамляе Інтэрфакс-Захад.

— Найбольшую занепакоенасць выклікае сітуацыя ў прамысловасці, дзе ў студзені—сакавіку 2009 года колькасць працаўнікоў, пераведзеных на няпоўны працоўны тыдзень, вырасла ў 4,3 разы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, а колькасць працаўнікоў, якім былі прадастаўленыя адпачынкі па ініцыятыве наймальнікаў, у 4,6 разы, — адзначыў намеснік старшыні ФПБ.

За чатыры месяцы электраэнергія падаражэла амаль на 50 працэнтаў

Нават нацыянальная статыстыка сведчыць, што ў Беларусі жыццё даражэе імклівымі тэмпамі.

За год на 25,3 працэнта падаражэла малако, на 22,7 працэнта — рыба і марапрадукты. А вось мяса і каўбаса сталі даражэй на 19,9 і 18,6 працэнта адпаведна. Кошты на муку за той жа перыяд падняліся на 32,7 працэнта. Яйкі падаражэлі на 19 працэнтаў, а цукар — на 13,6 працэнта. Бульба за год падаражэла на 23,7 працэнта. У той жа час кошт на гародніну вырас на 6,7, а на садавіну — на 13,2 працэнта.

